**Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы** / І.А. Абрамава і інш.; Уклад. М.В. Півавар. Мн.: Паркус плюс, 2008. 328 с.

Краязнаўства выконвае важныя сацыяльныя функцыі: стварае падставу для аб'яднання жыхароў краю ў жывы сацыяльны арганізм, магчымасці ўзаемаўзбагачальнага дыялога прадстаўнікоў розных пакаленняў, спрыяе перадачы і засваенню новымі пакаленнямі гістарычнай памяці на лакальным узроўні, фарміраванню патрыятызму, дае моладзі магчымасць асэнсаваць сваё месца ў гістарычнай перспектыве і надзённыя задачы. На фоне павышэння цікавасці насельніцтва да мінуўшчыны родных мясцін, актывізацыі намаганняў дзяржавы па ідэйна-патрыятычнаму выхаванню грамадзян уяўляецца актуальным і карысным з'яўленне ў навучальных установах Беларусі факультатыўных курсаў краязнаўчага характару («Оршазнаўства», «Чашніказнаўства»), а таксама выданне навучальнай літаратуры да гэтых курсаў. Гісторыю, асаблівасці і сучаснасць сваёй малой радзімы вывучаюць школьнікі з Ушаччыны, Верхнядзвіншчыны, Сенненшчыны і юныя палачане.

З ліку падобных кніг і рэцэнзуемае выданне, прысвечанае прыродным багаццям, гістарычнаму мінуламу, выдатным дзеячам і турысцка-краязнаўчым рэсурсам Віцебскага раёна. Кніга стала вынікам значнай працы вялікага аўтарскага калектыву, які аб'яднаў як школьных настаўнікаў, краязнаўцаў, так і прафесійных гісторыкаў, выкладчыкаў ВНУ Віцебска і Мінска. Укладальнікам выдання, а таксама аўтарам значнай колькасці змешчаных у ім матэрыялаў выступіў вядомы краязнаўца і даследчык, настаўнік Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі для здольных і адораных вучняў, кандыдат гістарычных навук М.В. Півавар. Кніга была падрыхтавана па ініцыятыве Віцебскага раённага выканаўчага камітэта і выйшла ў свет дзякуючы яго фінансавай падтрымцы. Афіцыйнымі рэцэнзентамі выдання выступілі прафесар Г.В. Штыхаў і дацэнт Г.М. Якаўлева.

Перад аўтарамі стаяла няпростая праблема вызначэння тэрытарыяльных межаў, якія павінны былі быць ахоплены ў выданні. Яны слушна не сталі абмяжоўвацца сучаснымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі межамі, справядліва адзначыўшы ва ўводзінах, што «некаторыя тэрыторыі, якія на працягу гісторыі ўваходзілі ў склад Віцебскай зямлі, княства, Віцебскага павета, цяпер належаць да сумежных раёнаў. Аднак з імі звязаны важныя падзеі ў гісторыі краю. Таму ў адпаведным раздзеле аўтары ўжывалі тэрміны "Прыдзвінскі край", "Прыдзвінне", "Паўночна-ўсходняя Віцебшчына". Пад Прыдзвіннем у межах дадзенага выдання мы разумеем рэгіён, які гістарычна, геаграфічна і адміністрацыйна прывязаны да г. Віцебска. Сюды мы ўключаем частку Бешанковіцкага раёна (в. Астроўна), Гарадоцкага (в. Ноўка), Лёзненскага (в. Высачаны, Крынкі, Веляшкавічы)» (с. 7).

Асноўная частка выдання складаецца з трох раздзелаў: «Прырода Віцебскага раёна» (навуковы рэдактар – кандыдат біялагічных навук, дацэнт А.М. Дарафееў), «Гісторыя Віцебскага Прыдзвіння» (навуковы рэдактар – кандыдат гістарычных навук А.М. Дулаў), «Гонар і слава краю» (навуковы рэдактар – І.А. Абрамава). У першым раздзеле мінуўшчына малой радзімы разглядаецца ў кантэксце гісторыі Беларусі. У значнай ступені ён носіць даследчы характар. Пры напісанні раздзела былі выкарыстаны матэрыялы, выяўленыя аўтарамі ў час археалагічных раскопак, архіўных росшукаў, рарытэтныя дарэвалюцыйныя выданні (публікацыі гістарычных крыніц, працы гісторыкаў і краязнаўцаў), гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць» Віцебскага раёна.

Трэці раздзел прысвечаны знакамітым землякам, легендам і паданням Віцебшчыны. Тут прыводзяцца цікавыя звесткі пра Маркаў Свята-Троіцкі і Тадулінскі Свята-Успенскі манастыры. Прадстаўлены арыгінальныя аўтарскія распрацоўкі М.В. Півавара, якія дэманструюць турысцка-экскурсійны патэнцыял Віцебскага раёна.

У рэцэнзуемай рабоце змешчаны грунтоўныя дадаткі і бібліяграфічныя спісы (рэдкіх і рэкамендаваных выданняў), што маюць самастойнае значэнне і могуць паспрыяць у далейшых даследаваннях Віцебшчыны. У кнізе прыведзена найбольш поўная на сённяшні дзень храналогія падзей з гісторыі Віцебскага Прыдзвіння.

Кніга ярка і густоўна аформлена. Аднак звяртае на сябе ўвагу нераўнамернасць падбору ілюстрацыйнага матэрыялу, асабліва ў гістарычным раздзеле. Праблему недахопу ілюстрацый можна было вырашыць, звярнуўшыся ў Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў у г. Дзяржынску. Не зусім адпавядае рэчаіснасці сцвярджэнне, што пасада Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, якую ў 1971–1976 гг. займаў ураджэнец Віцебскага раёна Ф.А. Сурганаў, па сучасных мерках эквівалентна пасадзе прэзідэнта краіны (с. 180). На наш погляд, аўтарам трэба надаць больш увагі сацыяльнаму, нацыянальнаму і канфесійнаму складу насельніцтва Віцебшчыны. Каб стаць краязнаўцам, лепш любіць родныя мясціны, мала ведаць пра прыроду, навакольны свет, пра людзей і падзеі, што звязаны з адпаведным краем, патрэбны звесткі пра мову, вусную народную творчасць. Гаворка ідзе пра літаратурна-краязнаўчы напрамак работы, пра літаратурныя мясціны раёна, стварэнне адпаведнага даведніка з улікам архівазнаўства і археаграфіі, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства. Сярод выдатных землякоў чамусьці не знайшлося месца нашым сучаснікам.

Гэтыя заўвагі могуць быць улічаны ў далейшых даследаваннях гістарычнага мінулага Віцебскага раёна. Кніга «Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы» паспрыяе задавальненню цікаўнасці шырокага кола чытачоў да лакальнай гісторыі, стане карысным дапаможнікам для настаўнікаў раёна, які можа быць выкарыстаны як на факультатыўных занятках, так і ў пазашкольнай краязнаўчай працы. Краязнаўцы – сапраўдныя патрыёты сваёй Бацькаўшчыны. І калі сёння мы гаворым пра нацыянальную ідэю, якая павінна быць асновай грамадзянскага яднання, пра ідэалогію беларускай дзяржаўнасці для XXI ст., то трэба яшчэ і яшчэ раз узгадаць, што Радзіма пачынаецца з любві да родных мясцін, з той песні, якую чуў малы з вуснаў маці, з той прыроды, сярод якой рос чалавек, з ведаў пра людзей і падзеі, што адбываліся ў краі. Не ўсё, аб чым гаворыцца ў кнізе, адназначна. Але яна адраджае агульны малюнак нашага жыцця, дапамагае лепш яго разумець.

Выданне такіх кніг, несумненна, карысна. На іх аснове можна было б пачаць вывучэнне краязнаўства ў ВНУ, а яно б паспрыяла выхаванню моладзі. І міжвольна ўсплываюць у памяці радкі з паэмы народнага паэта Беларусі А. Куляшова:

Край беларускі з матчынай калыскі
Да гэтых дзён мне дарагі і блізкі.
Я сын яго і ганаруся тым,
Што з ім паветрам дыхаю адным.

***У.К. Коршук***,
доктар гістарычных навук,
прафесар